УДК 2

# ПАЎСТАННЕ ШЫМОНА БАР-КОХБЫ: ХРАНАЛОГІЯ, ГІСТАРЫЧНАЯ РОЛЯ, АЦЭНКА СУЧАСНІКАЎ

**Клімовіч Аляксандр Уладзіміравіч,**
Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт імя А. С. Пушкіна (г. Брэст, Беларусь)

*Гэтая праца прысвечана вывучэнню і аналізу іўдзейскага паўстання пад кіраўніцтвам Шымона Бар-Кохбы, адной з найбольш цікавых, але слаба вывучаных падзей у гісторыі іўдзейскага народа. У працы адлюстраваны ход асноўных падзей паўстання, яго прычыны і вынікі. Акрамя таго, зроблена спроба прааналізаваць гістарычную ролю паўстання ў жыцці яўрэйскага народа. Асаблівая ўвага нададзена ацэнцы вызначаных падзей у творах рымскіх, іўдзейскіх і раннехрысціянскіх аўтараў, а таксама ролі паўстання ў канчатковым аддзяленні хрысціянскай царквы ад іўдзейскай.*

Паўстанне Шымона Бар-Кохбы з’яўляецца адной з найбольш важных падзей у жыцці яўрэйскага народа, звесткі аб якой даволі абмежаваны. Шэраг фактаў пра яе ўтрымліваюць працы тагачасных рымскіх гісторыкаў, а таксама творы раннехрысціянскіх пісьменнікаў; пэўную інфармацыю аб гэтым перыядзе можна атрымаць і з рэлігійных крыніц іўдаізму (Талмуд, Мішна). Недахоп крыніц па гісторыі гэтага перыяду шмат у чым абумоўлівае і рознае стаўленне да адзначаных падзей, у першую чаргу з боку даследчыкаў хрысціянства і іўдаізму, што патрабуе асаблівай ўвагі пры звяртанні да тых ці іншых крыніц па гісторыі гэтага перыяду.

Шэраг даследчыкаў разглядае паўстанне Бар-Кохбы як заключны этап т. зв. «перыяду Другога Храму». Пасля падаўлення паўстання зелотаў і сікарыяў і знішчэння Іерусалімскага храма яўрэйскі народ не страціў надзей на аднаўленне сваёй дзяржаўнасці і на працягу 115-118 гг. тройчы спрабаваў зрынуць ненавісную ўладу рымлян; гэтыя падзеі ў гістарычнай навуцы характэрызуюцца як другая іўдзейская вайна. У 118г. імператарам становіцца Адрыян, і пры ім цэнтр нацыянальна-вызваленчага руху змяшчаецца ў Палесціну. Такім чынам, можна зрабіць выснову, што паўстанне Шымона Бар-Кохбы як састаўная частка барацьбы яўрэйскага народа за незалежнасць з’яўляецца адным з этапаў другой іўдзейскай вайны.

Варта спыніцца і на такім важным пытанні, як ацэнка падзей паўстання з боку прадстаўнікоў іўдаізму і хрысціянства. На гэтым этапе трэба зрабіць пэўную агаворку. Калі большасць свецкіх гісторыкаў, якія займаюцца вывучэннем гісторыі гэтага перыяду, вызначаюць паўстанне як канчатковы этап аддзялення раннехрысціянскай царквы ад іўдаізму, то большасць рэлігійных гісторыкаў ўвогуле адмаўляюць факт сумеснага існавання іўдаізма і хрысціянства, што абгрунтоўваюць прыкладамі з рэлігійных тэкстаў хрысціян. Толькі ў Дзеяннях Апосталаў падаецца нямала прыкладаў розных ганенняў у дачыненні да хрысціян. Першапачаткова яны носяць бытавы характар, у больш позніх прыкладах характар прыцісненняў змяняецца, даходзячы нават да фізічнага знішчэння прапаведнікаў. Актыўная празелітская дзейнасць спрыяла пераходу часткі яўрэйскага насельніцтва ў хрысціянства; такіх яўрэяў называлі



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

«мешумадзім» (знішчанымі), быццам бы іх ніколі і не існавала [4, ст. 32]. У творах царкоўных гісторыкаў кіраўнік паўстання Шымон Бар – Кохба паўстае злачынцам, самазванцам і жорсткім ганіцелем хрысціян [2]. Так, Яўсевій Кесарыйскі ў сваёй «Царкоўнай гісторыі» сцвярджае, што паўстанцы катавалі хрысціян за іх веру, аднак у адным з лістоў Бар – Кохбы, які быў знойдзены пры раскопках у 1952 г., утрымліваецца ягоны прыказ не рабіць хрысціянам шкоды [1, т. 30, ст. 1282]. Выяўленне гэтага факта выклікае шэраг пытанняў, на якія гістарычная навука толькі рыхтуецца даць адназначны адказ.

Да сённяшняга часу існуе шмат версій аб тым, што ж сталася прычынамі выбуху паўстання; у якасці галоўных і найбольш верагодных гісторыкі згадваюць загад імператара Адрыяна аб смяротным пакаранні за абразанне, а таксама перайменаванне Іерусаліма ў Юлій Капіталіна з абавязкам яўрэяў плаціць налогі на ўтрыманне паганскіх багоў [5]. На чале ўспыхнуўшага паўстання сталі Шымон Бар – Кохба і раббі Аківа бен – Іосіф [1, т. 30, ст. 1282]. Менавіта раббі Аківа на правах духоўнага лідэра вылучыў Бар-Кохбу як кіраўніка паўстання, а сваю мянушку Бар-Кохба (у перакладзе з арамейскай мовы «сын зоркі») ён атрымаў за тое, што быццам бы з яго асобай было звязана старажытнае прароцтва Валаама аб узыходзячай ад Іакава зорцы (Кніга Лічбаў, 24:17).

У самым пачатку паўстання поспех быў на баку ваяроў Бар-Кохбы, шмат у чым з-за першапачатковай недаацэнкі з боку рымлян [3, гл. 69, ст. 43]. Нешматлікія рымскія гарнізоны былі знішчаны, паўстанцы занялі шэраг цытадэлей правінцыі, ведучы актыўную партызанскую барацьбу [3, гл. 69, ст. 43]. Сам Бар-Кохба быў абвешчаны царом, паступова пачала наладжвацца эканоміка, штодзеннае жыццё рэгулявалася законамі іўдаізму; у выніку археалагічных раскопак на гэтых землях знойдзены нават манеты з выявай Бар-Кохбы і надпісам «насі Ізраэль» (князь Ізраіля) [5].

Занепакоены пашырэннем паўстання, імператар Адрыян выклікае з Брытаніі аднаго з найлепшых сваіх палкаводцаў – Сэкста Юлія Севера [3, гл. 69, ст. 43]. Відавочна, што з прыбыццём Севера паўстанцы вымушаны былі сустрэцца з вельмі небяспечным ворагам. Рымскія войскі, дзякуючы ўдалай тактыцы, накіраванай на стварэнне перашкод паўстанцам у здабычы ежы і піцця, усё далей прасоўваюцца ўглыб правінцыі [3, гл. 69, ст. 43]. На пачатак 135г. галоўным цэнтрам супраціўлення застаецца крэпасць Бетар, дзе і заняў абарону сам Бар-Кохба [5]. Доўгая аблога крэпасці прынесла поспех Северу – горад быў заняты рымскімі войскамі (па некаторых дадзеных паўстанцы, змучаныя голадам, самі склалі зброю) [6, ст. 136]. Што тычыцца самога Бар – Кохбы,то адны даследчыкі лічаць, што ён загінуў падчас абароны горада, іншыя сцвярджаюць, што ён памёр ад укусу змяі. Як бы там ні было, пасля страты свайго лідара, паўстанне паступова было цалкам падаўлена, мала хто з яго удзельнікаў ўвогуле застаўся ў жывых [3, гл. 69, ст. 43]. Іншыя кіраўнікі паўстання (у тым ліку і раббі Аківа) былі жорстка пакараны рымлянамі, прычым з самога раббі, яшчэ жывога, абадралі скуру. Па рэакцыйных законах Адрыяна яўрэям пад страхам смерці было забаронена выкананне рэлігійных абрадаў і выкладанне закона Маісея, а таксама пражыванне ў межах іерусаліма. Вялікая колькасць яўрэяў, якая лічыла сябе падманутай у сваіх месіянскіх чаканнях, пачала лічыць Бар-Кохбу падманшчыкам і згубцам і прыдумала яму прозвішча Бар-Казіба («сын хлусні») [6, ст. 136]. Для іншых ён стаў сапраўдным нацыянальным героем, што змагаўся за свабоду і незалежнасць свайго народу.

Такім чынам, падводзячы вынікі паўстанню, трэба адзначыць, што яно па сутнасці было апошняй спробай яўрэйскага народа атрымаць нацыянальную незалежнасць. Параза паўстання прывяла да трагічнага выніку – шматлікае яўрэйскае насельніцтва рэгіёна было вымушана з'ехаць з роднай зямлі і рассяліцца па іншых краінах і зем-



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

лях. Са станоўчых вынікаў паўстання трэба вылучыць той факт, што страта надзеі на ўласную дзяржаву прывяла да перагляду яўрэйскага светапогляду — асноўная ўвага пачала надавацца захаванню ўласных традыцый і культуры, этнічнай самабытнасці і непаўторнасці. Вымушаны існаваць у нязвыклых умовах жыцця, яўрэйскі народ захаваў сваю ўнікальнасць, выратаваўшы сваю гісторыю і культуру для ўсёй чалавечай супольнасці.

## Літаратура


1. Большая Советская энциклопедия: в 30 т. - М., 1969–1978 гг. – Т. 30.
2. Православная энциклопедия [Электронный ресурс]. – Бар–Кохба. – Режим доступа: http://www.pravenc.ru/text/77550.html – Дата доступа: 12.02.2018 г.
3. Римская история: в 80 кн. – Кн. 69 — Дион Кассий.
4. Христианство / О. А. Чигиринская, О. Е. Дорошенко. – Харьков: Фолио, 2013 г. – 153 с.
5. Электронная еврейская энциклопедия [Электронный ресурс] – Восстание Бар–Кохбы. – Режим доступа: http://eleven.co.il/jewish-people-history/mishnah-and-talmud-period/10418/. – Дата доступа: 11.02.2018 г.
6. Энциклопедический словарь Брокгауза и Ефрона : в 86 т. (82 т. и 4 доп.). – СПб., 1890–1907. – Т. III (1891): Банки–Бергер.


Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова